

# Зямля бацькоў у памяці маёй

I праз сотні гадоў
Роднай хаты цяпло
Не астыне ў сэрцы маім



Рудэнка І.М. нарадзіўся 2 студзеня 1943 года ў весцы Селішча-1 Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыў Гомельскі Дзяржаўны педагагічны універсітэт. 42 гады адпрацаваў у школе – выкладаў гісторыю, геаграфію і немецкую мову. З 2005 года жыве ў горадзе Гарадку Віцебскай вобласці.

# МАЯ БЕЛАРУСЬ

Беларусь ты, мая Беларусь
Сінявокая цуда – краіна
Ганаруся табой, ганарусь,
Як прыгожай чароўнай дзяўчынай.

У блакіце шматлікіх азёр
Сонца грае, купаюцца зоры.
Беларусь ты, мая Беларусь
Сэрдцу мілыя далі, прасторы.

На шырокіх прасторах тваіх
Многа ёсць вугалкоў запаведных
Белавежская пушча шуміць.
І Бярэзінскі дыша бязмежны.

І сасновы бары, і бярозаў гаі
Яшчэ помняць сыноў – партызанаў,
Доўга колісь грымелі цяжкія баі
Адгукаюцца ў сэрцах яны ветэранаў.

Дык квітней і мацней і жыві Беларусь
І твой добры народ працавіты.
Каб ніколі ўжо чорным крылам бяда
Не кранала твае аксаміты.

Што табе пажадаць, маці – Белая Русь!
Каб ні войн і ніякай навалы,
Каб заўсёды гучалі на роднай зямлі
Мова Коласа, песні Купалы.

## РОДНЫЕ ПРОСТОРЫ

Ничего нет на свете красивей
Чем родные, святые места
Где с черемухи сыплется иней
И поля – нет красивей холста.
Небеса там всегда золотые
И озер голубые глаза
Песни льются с души удалые,
Где поет и играет душа.
Там заря в капли росных играет,
Там чудеснейший брезжит рассвет
Нет прекраснее родины нашей
Мест красивее в мире уж нет.
Запах хлеба, что выпекут в печке
Режет ноздри до старости лет
Идут с пастбищ коровы, овечки,
А вот гонят коней на ночлег.
А как ночью гармошка играет,
Как девчата чудесно поют!
И душа у ребят замирает
О, прекрасен деревни уют.
А на небе к погоде сполоха
Нас тревожит и спать не дает
И сердечные девичьи вздохи…
Как чудесно гармошка поет.

# РАДЗІМА

Люблю цябе, мая Радзіма
Што ўзрасціла, зберагла
Што мудрасць, хараство і сілу
Што шчасце, долю мне дала.
Люблю я лес, што за ракою
І хмарак рой, што звіс над ім
Люблю я поле залатое
З жытнёвым коласам густым.
Люблю я слухаць,як у гаі
Спявае песню салавей
Як пад гарой журчыць і бае
Адвечку песню мне ручэй.
Люблю шырокія прасторы
Радзімы маці – Беларусі.
Табой радзімая старонка
Усё жыццё я ганаруся.

## ЗЯМЛЯ БАЦЬКОЎ

Зямля бацькоў пад белымі крыламі
Ніколі ў памяці маёй не згінеш ты,
Над зеленню палёў і над лясамі
Стагоддзі пралятаюць, як вятры.

У памяці сыноў ты не сатрэшся,
Заўсёды будзе сніцца тая хата,
Дзе нас расцілі, песцілі, вучылі
Бабуля, дзед, матуля, тата.

У квецені садоў і зелені лясоў
Наш родны кут, ён нам заўсёды мілы
Цябе забыць не зможам аніяк,
Бо ты крыніца мудрасці і сілы.

І хоць радзей круізы да Радзімы,
Ды часта бачу ў сне цябе мой родны край.
Мне часта сняцца родныя мясціны,
Бо родны край заўсёды мне, як рай.

# ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Дзень Незалежнасці Рэспублікі маёй
Святкуюць свята ўсіх узростаў людзі.
Няхай жа назаўжды забудзецца бяда
І ў жыцці нашым толькі шчасце будзе.

І няхай сонца промні лье свае
На мірную зямлю і на палёў прасторы,
Каб працаваў і жыў у шчасці мой народ
І каб ніколі больш не бачыў гора.

Да Незалежнасці нялёгкім быў наш шлях
Яе мы ў мірны час і ў час вайны кавалі
Бывала вораг ненажэрны лез да нас
А мы сябе пакрыўдзіць не давалі.

У Дзень Незалежнасці Рэспублікі маёй
На плошчы гарадоў і плошчу нашае сталіцы
Сцякаецца ўсіх узростаў люд,
Каб нізка ўсім героям пакланіцца.

# ПЕРАМОГА

Прайшло ўжо шмат гадоў-
Час – зусім няблізкі.
На месцы былых баёў
Горыч вайны – абеліскі.
Ужо колькі год прайшло
Вайны ўспамінаюцца беды.
Сын прыходзіць да бацькі,
А ўнук прыходзіць да дзеда.
Паклонімся мёртвым усім,
Успомнім і бацьку і дзеда
І з вуснаў няхай прагучыць
Вялікае слова "Победа!"
Цяжкай цаной далося
Нам важкае гэта слова.
Над усёй зямлёй узнялося
Для людзей на зямлі – аснова.
Усялякую нечысць білі-
І румын, і германцаў, і шведаў,
І заўсёды гучала з вуснаў славян
Вялікае слова – "Победа!"

## ВЯСНА

На палянцы ля ўзлеску
Сонца промнямі грае,
Цешыць ласкай пралеску,
Усё вакол саграваe.

Усё мацней свеціць сонца
Цешыць ласкаю скроні,
І зялёная траўка
Цягне к небу далоні.

Раўчукі ўжо пабеглі,
Уніз па схіле ў даліну,
Напаілі мурог,
Ажывілі маліну.

У садку каля хаты
Шчодра сонцам сагрэты,
Хутка ўжо зацвітуць
Залатыя ранеты.

Пчолкі ў вуллях прачнулісь,
Загулі, загудзелі,
І шукаць сабе ежу
У палі паляцелі.

## ВЕСНА

Весна немного задержалась,
Но знаем все – должна прийти
С утра метель еще взыгралась,
Но знают все – весна в пути.

На юге сев уже в разгаре
У нас сугробов намело!
Там грач с грачихой ходят парой
У нас вокруг светлым – светло.

О жизни круг: всё в повтореньи
Любовь и страсть на круге том
Всё в быстром, яростном движеньи
Всё в сотвореньи неземном.

Приход весны- взрыв к страсти, к жизни
Давно так в жизни повелось,
И волчий вой и рык лосиный
В крови вскипает к жизни зов!

Весна – творение природы,
Всё в нашей жизни круговерть
И очень жаль: уходят годы,
Ведь рядом ходят – жизнь и смерть.

# НАДЫХОД ВОСЕНІ

Яшчэ трава не ўся зрыжэла
На яркіх летніх лугавінах,
А ўжо відаць асенні подых
На дрэў высокіх вершалінах.

Вада ў рэчцы пацямнела,
І ранак раптам стаў марозны.
Ступае восень, хоць нясмела
І красіць дрэвы фарбай рознай.

На ўскрайку лесу – нібы свечкі,
Гараць дубы, асіны, клёны,
Па лузе, нібы-та авечкі,
Стагі разбіліся наўкола.

Закружыць вецер, потым сціхне,
Пажоўклы ліст у паветры кружыць,
І клін апошні, жураўліны,
Імкнецца ўвысь, крычыць і тужыць.

* * *

Ідзеш ціха лясною ты сцежкай,
Ліст апалы ляжыць дываном,
Між дрэў сонца кранае ўсмешкай,
Ды лісіца мігне за кустом.

Дыхне вецер паўночны, халодны,
Куст рабіны гарыць пад вакном
Жураўлі, адлятаючы ў вырай,
“Да спаткання!” – махнуць мне крылом.

Сум чуваць у прыродзе прадзімні,
Сыпне з неба халодным дажджом
Хутка снегам пакрыецца зімнік,
Будзе рэчка бруіць пад ільдом.

## 1 ВЕРАСНЯ

Гэты дзень для мяне знакаміты,
У навуку, сябры, я іду.
І палёў, і лясоў аксаміты
Усё, сябры, у сябе ўбяру.

Першы раз пазнаёмлюся з мірам,
Дзе не так, як звычайна ў жыцці,
І настаўнік мой першы, кумір мой,
Ён мяне павядзе па жыцці.

Дык няхай гэты дзень будзе ўдалым
І няхай шчасце мне прынясе.
Я аб гэтым даўно, браткі, марыў,
Мудрасць свету збіраць пакрысе.

Бо няма найцікавей нічога
Чым пазнанне матулі-зямлі
Пазнаюць яе чары спрадвеку
Народ просты, цары, каралі.

* * *

Помню першы вераснёўскі
Помню той прыгожы ранак
Калі клаў на плечы ранец
І ўзлятаў на школьны ганак.

Браў букет адметны, добры
З самых лепшых яркіх кветак
Каб настаўніку, вядома,
Падарыць яго з прыветам.

З хваляваннем непаўторным
Я ўрок свой помню першы
Цяпер сам ужо настаўнік
Сам пішу аб школе вершы.

## У ШКОЛУ

Хутка школьны званок
Нас пакліча ў школу,
І ўсе летнія дні ў вачах праплывуць,
І лясныя дарожкі, палявыя сцяжынкі –
Усё згадае аб тым,
Як дні хутка бягуць.

Усе прыйдзем у школу
Сядзем дружна за парты
Няхай кожны з нас  помніць,
Што Радзімы ён сын.
І аб нашай Радзіме, аб леце вясёлым
Усе старанна напішам
сачыненне-успамін.

## УЧИТЕЛЬ

Наш любимый учитель,
Ты всегда с нами строг,
Сто путей у нас в жизни
И сто  разных дорог.
Но учитель нас всегда ты
Выбирать только ту,
По которой идти нам в золотую мечту.

Ты учил нас всегда
Справедливыми быть,
Мать-отчизну любить
Дружбу крепко ценить
Был строг с нами всегда,
Как на фронте  комдив,
Хоть суров иногда,
Но всегда справедлив.

## У ШКОЛУ

Адкрываюцца школьныя дзверы,
Пераступім заветны парог.
Прадстаўляюцца з думкамі, верай:
Колькі шчасця і колькі дарог!
Мы аб лёгкім жыцці і не марым,
Бо ніколі такім не было.
Кожны з нас Каралёў і Гагарын,
Кожны з нас і Энштэйн і Бруно.
Вось настаўнік наш першы прыходзіць,
У яго рукі свой лёс аддаём,
Па дарозе жыцця ён нас водзіць,
Таямніцы жыцця пазнаём.
Дык няхай жа ў кожнага будзе
Прага к ведам і добры настрой,
Каб на свеце ўсё добрыя людзі
Ішлі упарта да мэты сваёй.

**ПЕРШАКЛАСНІКУ**

Хутка нам у школу,
Хутка першы ўрок
Празвініць прыветна
Весялун – званок.
Празвініць гурбою
Пабяжым мы ў клас
І за парту ціха
Сядзе кожны з нас.
У краіну ведаў
Пойдзем мы, сябры,
Доўга мы чакалі
Школьнае пары.

**ЖЫВІ, ПРАЦУЙ!**

Жыві, працуй
І будзеш сыты
Не будзеш богам
Ты забыты.

Раней уставай
Трымай у парадку
Свой агарод
І родну хатку.

Заўсёды звычай
Такі знай:
Дзяцей да працы
Прывучай…

Ты сей, браток
Такое семя
Каб усё здаровым
Было племя

Калі ўзыйдуць абібокі
То ў бацькі будуць балець бокі
А лежні- вырастуць унукі
Не будзе горшай тады мукі.

# ХЛЕБ

Я хлеб – найвялікшую святыню
У рукі бяру беражліва.
Я помню вайны ліхалецце
Той год 41-ы імклівы.
Я помню ліхую навалу,
Жыццё тое бурнае помню,
Калі край варожаю хмарай
Акутаны быў, як сцяною.
Даўно б захлынуліся ў дыме
І злобе варожыя сілы,
Ды хлеб нам даваў тую сілу,
Каб моцны народу хапіла.
Прагналі варожыя хмары,
Адолелі злую навалу.
Стаіць наш хлеб сёння сцяною,
Як мы ў 41-ым стаялі.

## АСТРАЎКІ ЖЫЦЦЯ

Астраўкамі жыцця называем зямлю,
Дзе дзяды і бацькі жылі нашы
І няма больш на свеце зямлі прыгажэй,
І няма больш куточка найкрашай.

І вядома ўсім нам нашы прашчуры там
Сярод пушчаў, балот пражывалі
І у полі з сахой, у ратнайсправе з мячом
Сабе лепшую долю кавалі.

Было ў іхнім жыцці шчасця, хоць і няшмат,
Калі песні спявалі, кахалі,
Моцна сэрцам любілі бацькоўскі свой край
І ў крыўду яго не давалі.

Беларускі наш край, што куточак, то рай
Ад бацькоў і дзядоў нам дастаўся,
Беражыце ж зямлю, вас прашу і малю,
Каб прыгожым унукам застаўся.

## ВОСЕНЬ

Клапатлівая восень усе палеткі прыбрала
Прыгажосць і парадак паўсюду навяла.
У садах і лясах зямлю лісцем заслала
Ды і пчолкі ўжо зрэдку гудзяць у верасах.

І стрыжы і буслы ў вырай усе адляцелі
Лес празрысты стаіць, патанеў, пахудзеў.
Тонка цінькне сініца, не стрыгуць карасцелі
І чуваць у прыродзе ўжо асенні напеў.

Наляціць раптам вецер, зашуміць, потым сціхне,
Праляціць над зямлей, пакалыша галінкамі дрэў.
І паўсюд над лясамі, палямі, лугамі
Чуваць сумны, трывожны асенні напеў.

Грае восень-музыка ўсім тужлівую песню
Відаць сумны настрой на ўсялякі лады.
І галінка ў бары ціха-ціхенька трэсне
Гэта дзік, або лось ціха ідуць да вады.

## НАВАЛЬНІЦА

Хмарка хутка пралятае
Поіць травы, поіць жыта,
Гром далека грамыхае:
Штосці кажа нам сярдзіта.

І маланка – зіхавіца
У міг асвеціць усе навокал,
Даўно сціхнуў птушак гоман.
Коціць хмарка бокам-бокам.

Праляцела, прашумела
Над палямі навальніца,
Ажывае птушак гоман,
Вадой поўніцца крыніца.

Усе змяняецца ў прыродзе:
Пройдзе дзень, прыходзіць новы
Зоркі ходзяць у карагодзе
І гне радуга падковы.

## ВОСЕНЬ

Восень – мілае стварэнне
Люба мне твая краса,
Ліста жоўтага кружэнне,
К поўдню птушак паласа.
Посвіст ветру, павуцінне,
Усё люба ўвосень мне.
Хмар даждлівых рабацінне,
Сонца блікі на сцяне.
Сумным крыкам жураўліным
Поўніць восень усё наўкол.
Ліст апошні з дрэва зносіць,
Усцілае спрытна дол.

## ЛИСТОПАД

Кончилось лето красное
Осень уже настает.
Листьев, с деревьев сорванных,
Виден последний полет.
Падают листья с кленов,
Падают листья с берез,
Их, от жизни оторванных,
Жалко до слез, жалко до слез…
Их, в дорогу последнюю
Ветер проводит и кажет путь,
Так и мы в обитель вечную
Улетим когда-нибудь.
Улетает душа с человека
У кого в рай, у кого и в ад
Каждому, по его заслугам
Выпишет Бог наряд.
Так живите же в мире, люди,
И желайте друг другу добра.
На висках пусть поменьше будет
Горести лет – седины серебра!

# ЗІМА ПРЫЙШЛА

Белы, белы, снег бялюткі
На палеткі, на лугі,
Падаў ціха, падаў хутка
Засцілаў абрусам белым
Лес і рэчак берагі.

А вось роўнінькім шнурочкам
Хтосці ўжо на полі бег
Гэта рыжая на снезе
Нам пакінула свой след.

К сонцу выставілі спіны
Усе палянкі і пагоркі,
Відаць зайца след на снезе
Мышкі ўсе палезлі ў норкі.

Скокнуў заяц у асіннік
І грызе галінкі хутка
У сваім дупле вавёрка
Бачыць сны, але спіць чутка.

# ПРЫХОД ЗІМЫ

На дарогі, на палеткі
На лугі, лясы, лагчынкі
Закружылі, паляцелі
Зімы першыя сняжынкі.

Усе сыпле, сыпле зверху
Нам сняжынак мноства неба.
Болей вольгаці вясною
Будзе болей бульбы, хлеба.

Замятае завіруха
Усе дарожкі, усе сцяжынкі,
Ураджай нам прадвяшчае
І багатыя дажынкі.

Усе зіме сапраўднай рады
Дзед Мароз стварае цуды.
І дзіцячы смех вяселы
Здалек чуецца паўсюды.

## НОВЫЙ ГОД

Новый год идет по стране
И в погожий день и в ненастье
Он приносит всем на Земле
Радость, удачу, счастье.

Новый год – надежда всех
Ждем мы в Новом – успехов, удачи
Пусть и малыми будут они
Ну, а как же друзья, иначе.

Пожелаем в этом году
Старикам от детей заботу
И чтоб в Новом нашли мы все
Кто невесту, кто ласку, а кто работу.

Чтоб зарплата была побольше
И чтоб пенсия потучнее
Белоруссия наша родная
Становилась все мощнее.

Мира, счастья, удачи в Новом
Пожелаю друзья я вам,
Чтоб побольше хорошего лилось
С новогодних телеграмм!

# ДА РОДНАЙ ХАТЫ

Сення цяжка дабрацца дадому:
Многа спраў ва ўсіх нас завялось.
Кіньце ўсе і да роднае хаты
Вы ляціце, як сын і як госць!
Заляцелі далека ці блізка
І дзе б вы па жыцці не былі,
Прыязджайце да роднае хаты,
Пакланіцеся роднай зямлі.
Як падыдзеш да роднага дому
Вось, здаецца, матуля бяжыць,
Вас абдыме, да сэрца прытуліць
Ды, не? Усе ў нейкім суме маўчыць.
Усе знаема да болю, да стогну…
Пахіліўся заборчык, стаіць
І бярозка ля роднае хаты,
Шэпча лісцем, да сэрца туліць.
Зойдзеш у хату, як сэрца біецца!
Хочаш матчын ты голас пачуць.
Мне б у бацькавы добрыя вочы
Яшчэ раз, ну хоць раз зазірнуць.
Са сцяны з фотаздымка паглянуць
Моўчкі спросяць: “Як, сынку, жывеш?”
Ці ў сям’і ў цябе ўсе добра,
Па жыцці, як ты, сынку, ідзеш?
Дзякуй, бацька, табе, дзякуй, маці
І пасля чую клопат я ваш
На бацькоўскія шчырыя словы
Пасняшаю даць поўны адказ.

* * *

Песні маей маладосці
Песні люцкой дабраты
Часта заву вас у госці
Душу сагрэлі каб вы

І не аднойчы, як цяжка
Часта бывае парой
Песні дзяцінства згадаю
І спачываю душой.

Розныя песні бываюць
Сумныя, радасці поўныя
Песні ваенных гадоў
Песні заўседы змястоўныя.

Часта душу акрыляла
Саму, сумленне давала
Часта, калі было цяжка
Песня настрой падымала.

У бітве, паходзе, на стройцы
Песня ўсюды гучала
Песня з кален падымала
Сілу і веру давала.

З гэтай верай заўседы
Цяжка была, або легка
Мы ў жыццевым паходзе
Сілы знаходзілі зноўку

Колісь у справах людзей
Ну а ні якай халтуры
Брацкую ТЭС будавалі
І Камсамольск-на-Амуры.

Была праўда ў песнях
Была і сола ў словых
І ў душах людзей чалавечых
Была праўды аснова.

## ДЗЕЦІ ВАЙНЫ

Нам прынесла вайна
Гора, крыўду, нягоды
Цяжка жыць нам прыйшлося
У ліхія, цяжкія гады.
Дзяды нашi, бацькі
Усе пайшлі ў паходы
Заставаліся маці, старыя бабулі
Ды мы, дзеці вайны.

Мы любілі зямлю.
І мы проста любілі
Бяраглі як маглі
Мы свой гонар і чэсць
Захаваць усе змаглі
І ў засценках гестапа
І ў лагерах смерці
Мы з надзеяй чакалі
Калі з поўдня ў весну
Паляцяць жураўлі.

Не забудзем ніколі дзіцячыя вочы
Што з-за кратаў глядзелі на свет
Жураўлі на Радзіму вясною ляцелі
Мы з надзеяй глядзелі заўседы ім услед.
Засталося нас мала партызан, ветэранаў
Мала ўжо засталося нас – дзетак вайны
Засталіся ўспаміны пра ліхія гадзіны
І няхай ужо ніколі не прыходзяць яны.

* * *

Мой родны край, як калыханка – песня
Заўседы сэрцу мілая майму
Спяшаюся туды я зімой і на прадвесні
Мой родны край, цябе я так люблю!

У душы ўзыграе штосьці маладое
Каб крылы меў – туды б адразу паляцеў
Бо там прайшло юнацтва залатое
Дзяцінства, і матулі роднай спеў.

Пазнаў я шчасце там, і горачы ўтраты
Душою зросся з роднаю зямлей
Цяпло бацькоўскай роднай мілай хаты
Навекі застанецца ў душы маей.

* * *

Когда бывает очень трудно
И очень грустно нам порой
Душа летит к родной земле
И обретает мир, покой.

Бывает вспомнишь детство, юность
И годы, что прошли с тобой.
Отцов и дедов помним мудрость
И обретаем мир, покой.

Летит душа в родные дали
Охота жить, есть к жизни страсть
К родной земле, к порогу дома
Всем сердцем хочется припасть.

* * *

Чуть забрезжит рассвет
И над поймой лугов и над ширью полей
И над вспаханным полем
Заколеблется пар, ярким солнцем согрет
Оживет все большое Беларуси раздолье

По просторам страны побегут поезда
И по шири полей тракторов гул несется
Везде занят трудом наш простой человек
И пусть радостью в сердце это все отзовется.

И у пульта ракет и в казармах солдат
И на мощных страны полигонах
Пусть на страже Отчизны сыны зорко стоят
И пусть звезды горят на погонах.

* * *

Апошні ліст дрыжыць на ветры
Сарвецца раптым, упадзе
Зіма змярае кіламетры
Да нас аж з Сіверу ідзе

На золку ціскане марозам
Адпусціць крыху, зноў нажме
Ужо чуваці зімы пагрозы
Але цяпла яшчэ стае.

Даўно заціхнуў рой пчаліны,
Ужо медам пахне на стале
І клін апошні, жураўліны
Над гарызонтым крылам б’е.

***

Пахне сонцам, пахне летам
Пахне яркім, яркім светам,
Пахне спелаю малінай
І чырвонаю ажынай.

Нават смачны пах і поту,
Як працуеш у ахвоту.
Пахне смачна, смачна хлебам,
Калі выпякуць, як трэба.

Пахне лесам і чаборам,
Пахне медам з ліпы свежым,
Асаблівы пах грыбовы,
Калі ты падружаш з борам.

А зямля як смачна пахне,
Калі пахар зямлю паша!
Няма запаху найлепей,
Няма запаху найкрашай.

Пахне мятай, медуніцай,
Пахне спелаю пшаніцай,
Пахне медам і чаборам
І прыгожым Любскім борам!

## ДЗЯЦІНСТВА МАЁ БАСАНОГАЕ

Мне дзяцінства маё басаногае
Усё гасцей і часцей успамінаецца,
Над Радзімай і неба высокае
І зара там інакш разгараецца.

Там паветра срабрыстае, чыстае
Грае у кроплях расы пераборамі
На ўсходзе зара залацістая
Сыпле срэбра сваё над азёрамі.

Люблю родны свой край, што куточак – то рай
Дзе травінка ў полі калышацца
І расінка ўсім усміхаецца,
А ў цёмным бары ўсё пяюць глухары
Салавей ля ракі заліваецца.

О, Радзіма мая, я часцінка твая
О, старонка мая: хараство непаўторнае
Калі выдасца вольна хвілінка
І прысніцца мне родна хацінка
Маё сэрца ляціць туды вольнае.

І аб родным, аб мілым, аб краі
Маё сэрца спявае, спявае,
Там у думках я часта бываю
І душою я там спачываю.

О, Радзіма мая, я часцінка твая
Маць – Белая Русь, сінявокая
Няхай доля шчаслівая будзе ў нас
І дарога да шчасця шырокая.

## ЛЮБІ МАЦІ-ЗЯМЛЮ

Любі маці-зямлю
Як і родную маці,
Хто не любіць яе
Можа гора спазнаці.

Хто не любіць зямлю
Ей заўжды пагарджае,
Той заўсёды, браткі,
У бяду пападае.

Вы ж любіце зямлю,
І палі, і крыніцы,
Мораў шыр-глыбіню,
І азёр таямніцы.

Дзе русалкі з вады
Апоўночы выходзяць
Хараводы ля вод
Ціха-ціха заводзяць.

Іх не бачыў ніхто
І не чуў іх ніколі
Гэта тайна іх душ
Згадкі іхняе долі.

Дык любіце зямлю,
Ёй не здрадзьце ніколі
Вас навучыць яна,
Як шукаць шлях да Волі.

* * *

Есть прелести у матушки зимы:
Кружится первый снег,
Ложится он на ветки тополей.
И первый лыжный след
Ложится меж полей.

И первый санный путь,
И снега скрип под полозами,
Следы лесных зверей
Всё ловим мы глазами.

И солнышка восход
Морозным ранним утром,
И снег блестит вокруг
Сияет перламутром.

Морозец первый дребезжит, а потом
Сильный, настоящий
Ударит, снег засеребрит
С зарёю зимней, восходящей.

**ВПЕРЕД, ОЛИМПИЙЦЫ!**

Мы гордый народ, белорусы,
Мы славный и сильный народ,
Вперед к Олимпийским медалям
Заря нашей славы встает.

К финишу мчится Дарья орлицей,
Флаг поднимается вновь над столицей
Снова ликует народ Беларуси
Ведь мы потомки Белое Руси.

Трудом и упорным и славным
Прославим отчизну свою,
И гимном могучим, державным
Озвучим свободу свою.

## ХРИСТИАНСТВО НА РУСИ

Князь Владимир могуч,
Князь умен и красив,
Христианство решил
Принять он на Руси.

Поп икону держал,
И смотрел с ней Христос
Каждый брат-славянин
Телом, духом возрос.

Тучи грозные шли,
Ветер с севера дул
Испугался, убёг
И удрал Вельзевул.

По колени зашли
Все в могучий Днепро,
Каждый воду кропил
На себя, на чело.

Три славянских народа
Слились в Киевску Русь:
Украина, Россия
И моя Беларусь.

* * *

Песні мёй маладосці
Песні людской дабрыні
Часта заву вас у госці
Душу сагрэлі мне вы.

І не аднойчы, як цяжка
Часта бывае парой
Песні дзцінства згадаю
І спачываю душой.

Родныя песні бываюць
Сумныя, радасці поўныя
Песні ваенных гадоў
Песні заўсёды змястоўныя.

Песня душу акрыляла
Сілу, сумленне давала
Часта, калі было цяжка
Песня настрой падымала.

У бітве, у паходзе, на стройцы
Песня ўсюду гучала.
Сілу і веру давала
Песня з кален падымала.

З гэтаю верай заўсёды
Цяжка было, або лёгка
Мы ў жыццёвым паходзе
Сілы знаходзілі зноўку.

Колісь у справах людзей:
Ну а ніякай хаўтуры
Брацкую ГЭС будавалі
І Камсамольк-на-Амуры.

* * *

Песні мёй маладосці
Песні людской дабрыні
Часта заву вас у госці
Душу сагрэлі мне вы.

І не аднойчы, як цяжка
Часта бывае парой
Песні дзцінства згадаю
І спачываю душой.

Родныя песні бываюць
Сумныя, радасці поўныя
Песні ваенных гадоў
Песні заўсёды змястоўныя.

Песня душу акрыляла
Сілу, сумленне давала
Часта, калі было цяжка
Песня настрой падымала.

У бітве, у паходзе, на стройцы
Песня ўсюду гучала.
Сілу і веру давала
Песня з кален падымала.

З гэтаю верай заўсёды
Цяжка было, або лёгка
Мы ў жыццёвым паходзе
Сілы знаходзілі зноўку.

Колісь у справах людзей:
Ну а ніякай хаўтуры
Брацкую ГЭС будавалі
І Камсамольк-на-Амуры.

* * *

Любімай жонцы
Ніне Мікалаеўне
пасвячаецца



Плача неба,
Няма сонца
Па маей любімай плача
Жаль душу апавявае
І накатвае бясконца
Плача неба, плача, плача.
Цяжкім, цяжкім
Было жыцце
Тры дачкі было ў маці
Муж у час вайны загінуў
Засталося тры дзіцяці.
Цяжка маці, цяжка маці.
Падняла ўсіх на ногі
Адзявала, абувала
Падаліся ўсе ў навуку
Усе сталымі пасталі.
Выйшлі замуж, падружылісь
Дый жыцце някепскім стала
Толькі б жыць ды жыць на свеце
Ды прыйшла бяда – нязвана
Сэрца ў любай забалела:
Год мінулых адпячаткі
Цяжка жыць пасля вайны
Ох і цяжка жыць без таткі.
На плячах і дровы, сена
Часта босы і галодны
І ў вадзе аж на калена
І ледзяной вадзе, халоднай
Вось і вынік: парок сэрца
Потым болі і бальныцы

Ой і цяжка ей прыйшлося
Змардавалі маладзіцу
Аперацыя на сэрцы:
Найцяжэйшай не бывае
Так хацела жыть на свеце
Рабі доктар: усе стрываю.
Восем дзен ляжала ў коме
Ледзь прачнулася, вядома
Стала крыху папраўляцца
І да дому, і да дому!
Дзевяць год жыла з надзеяй
Што ўсе будзе далей добра
І ў дзень - 9 марта
Усім зрабілася нядобра.
Больш няма любімай жонкі
Усе паплакалі – вядома
Ох і цяжка заставацца
Ох і цяжка жыць одному.
Смерць усякіх забірае
І знямоглых і няхілых
Ну, а болей забірае
Сэрцу любых, сэрцу міых…